# Калодзеж і крыніца — пасрэднікі паміж вадой нябеснай і падземнай

**У абрадах выклікання дажджу важнае месца займалі калодзеж і крыніца. Фактычна яны станавіліся своеасаблівым цэнтрам Сусвету, вакол якога выконваліся розныя абрадавыя дзеянні. Больш таго — калодзеж або крыніца выступалі сакральным эпіцэнтрам, у якім перакрыжоўваліся як вертыкальныя, так і гарызантальныя плоскасці сістэмы міфарытуальных каардынат.**

## "Слёзы глыбінь"

"Апладняльная" вада можа прыходзіць на зямлю не толькі ў выглядзе дажджу — "слязы нябёсаў", але і выходзіць на паверхню з-пад зямлі, як падарунак падземнага бажаства — "слёзы глыбінь". Па народных уяўленнях, і не беспадстаўна, крынічную ваду лічаць лекавай, цудадзейнай і называюць "гаючай вільгаццю".

Крыніцы заўсёды былі надзелены асаблівай святасцю, да іх ставіліся з павагай, ушаноўвалі. Цуд раптоўнага з'яўлення крыніцы звязвалі з нябесным бажаством і хрысціянскімі святымі. На месцы з'яўлення шматлікіх ікон Божай Маці і сёння б'юць крыніцы з гаючай вадой. Калі людзі знаходзілі такую крыніцу, то абавязкова ачышчалі яе ад пяску і ламачча, ставілі невялікі зруб, а побач узводзілі капліцу з абразамі Божай Маці і святой Параскевы-Пятніцы. Шматлікія гістарычныя запісы сведчаць, што побач са святымі крыніцамі праводзіліся масавыя набажэнствы, выконваліся абрады выклікання дажджу. Да іх прыходзілі пакланіцца, прынесці святочную ахвяру, а часам і паваражыць, каб зазірнуць у далёкую будучыню.

І ў святы, і ў будні да крыніц прыходзілі, каб перасцерагчы сябе ад хвароб або атрымаць пазбаўленне ад ужо напаткаўшых цяжкіх немачаў. Хадзілі да іх да ўзыходу сонца, "пакуль птушка не праляцела". Існавала павер'е, што "некранутая" вада валодае большай выратавальнай сілай. Звычай вымагаў ісці да крыніцы і вяртацца дадому моўчкі, ні з кім не размаўляючы і не вітаючыся. У некаторых выпадках лічылі, што да крыніцы неабходна ісці максімальна аголеным і босым. Асаблівай цудадзейнасцю ў народзе былі надзелены месцы, дзе сыходзілася вада з дзвюх-трох крыніц.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На Беларусі паўсюдна лічылася, што асаблівая лекавая моц крыніц раскрывалася пасля першых вясенне-летніх грымотаў: "маланкі разганяюць усю нячыстую сілу пасля зімы, а значыць, ачышчаюць і крыніцы". Акрамя гэтага наведванне гаючых крыніц прымяркоўвалі: у зімовы час — да святкавання Раства Хрыстовага, Новага года, Хрышчэння; у летні — да дня святога Георгія (6 мая), Вялікадня, Ушэсця, Тройцы, да Русальнага тыдня, да Іванава дня, асабліва на Дзявятнік і Дзявятуху (чацвер і пятніца на дзявятым паслявелікодным тыдні) і Дзясятнік і Дзясятуху (тыя ж дні на дзясятым паслявелікодным тыдні).

Існавала абавязковае правіла: набіраць ваду неабходна было толькі па ходу яе цячэння, адліваць "лішнюю" ваду назад у крыніцу катэгарычна забаранялася — можна было выліць яе побач, на зямлю.

У паўсядзённым жыцці пазбягалі наведваць крыніцы пасля заходу сонца. Народны этыкет забараняў праці бялізну ў крынічнай вадзе, купацца ў ёй парадзіхам, "нячыстым жанчынам", кідаць у іх смецце і г. д. Нездарма казалі: "Плюнуць у ваду, што маці ў вочы".

Нашы продкі былі перакананы: каб крынічная вада дапамагала і ніколі не знікала, ёй неабходна абавязкова прыносіць ахвяраванне, напрыклад кінуць манету; каля крыніц ставілі крыжы з іконамі, і тыя, хто прыходзіў сюды, павязвалі на іх ручнікі, хусткі, паясы, рознакаляровыя стужкі. Гэта традыцыя жыве на Беларусі і сёння.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

## Калідор на "той свет"

Па сутнасці, калодзеж — гэта тая ж самая крыніца, толькі знойдзеная і "адкрытая" чалавекам. Часцей за ўсё калодзеж капалі на тэрыторыі сваёй гаспадаркі, але бывала і так, што з аднаго калодзежа ваду брала ўся вёска. Калі пры хаце быў свой калодзеж, імкнуліся не піць ваду з чужога: "свая вада не пацячэ".

За месца выхаду падземнай вады і своеасаблівы пабудаваны "калідор" калодзеж успрымаўся ў народнай культуры як памежная прастора — канал сувязі з "тым", або "іншым", светам. Шматлікія славянскія казкі пачынаюцца з таго, што дзяўчына, дачка ці падчарка ўпусціла вядро ў калодзеж, і прыйшлося ёй ісці шукаць сваю рэч у "тым свеце". Калі бралі ваду з калодзежа, катэгарычна забаранялася выліваць яе назад. Лічылі, што "адтуль" на нас глядзяць продкі.

## "Першую" ваду не давайце чужому!

Асаблівая ўвага надавалася пошуку "ваданоснай жылы". Для гэтага, напрыклад, карысталіся дапамогай лазовай рамкі, якую падвешвалі на льняную нітку і павольна хадзілі па тым месцы, дзе хацелі капаць калодзеж. Там, дзе рамка пачне круціцца ў правы бок, і рабілі пазнаку. Другі варыянт быў больш старажытным і больш пашыраным на тэрыторыі рассялення беларусаў. Увечары на тым месцы, дзе збіраліся капаць калодзеж, раскладвалі патэльні. Калі раніцай, пры ўзыходзе сонца, патэльня пакрывалася вадзянымі струменьчыкамі, азначала, што калодзеж на гэтым месцы будзе доўга паіць вадой сямейства; мала на патэльні "поту зямнога" — мала і вады будзе ў калодзежы; сухая — вады не будзе. Таксама спрыяльнымі для будаўніцтва калодзежа лічыліся месцы, дзе растуць бузіна і шчаўе.

Звычайна пачатак будаўнічых работ прымяркоўвалі да "маладзіковай" фазы Месяца, улічвалі сетку спрыяльных і неспрыяльных дзён, напрыклад, адным з найбольш прадукцыйных лічыўся дзень 21 чэрвеня. А каб у калодзежы вады заўсёды было поўна, капаць пачыналі раніцай.

Распачынаць гэту працу павінен хлопец, які быў сынам яшчэ жывых бацькоў, сам фізічна здаровы чалавек. Такую справу не даручалі тым, за кім замацавалася кепская "слава": "у яго цяжкая рука" ці "ў яго дурное (дрэннае) вока". "Першую" зямлю на месцы будучага калодзежа неабходна было выбраць у выглядзе крыжа. Затым у цэнтр вылівалі асвечаную на Хрышчэнне ваду і чыталі замовы. Першае з'яўленне вады таксама суправаджалася рытуальнымі дзеяннямі: таму, хто капаў зямлю, дарылі новую кашулю ці кавалак палатна, а ў калодзеж кідалі манеты.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

"Першай" вадой паілі ўсіх членаў сям'і, свойскую жывёлу і птушку. Пільна сачылі за тым, каб яе не выпіў хто-небудзь іншы і не забраў здароўе сям'і, дабрабыт і прыбытак у гаспадарцы. Калі ў доме была бяздзетная жанчына, то "першую" ваду давалі пакаштаваць менавіта ёй.

Для таго, каб у калодзежы не знікала вада, перш, чым абкладваць дно, неабходна было ахвяраваць свойскую жывёлу. З прыходам хрысціянства выкарыстоўваць ваду з новага калодзежа можна было толькі пасля яе асвячэння.

У народзе існаваў шэраг правілаў, якія абмяжоўвалі кола тых людзей, што могуць браць ваду з калодзежа. Перш за ўсё, асабліва ў дні вялікіх святаў, забаранялася браць ваду чужым, пабочным людзям — каб не перадаць ім дабрабыт сям'і і прыбытак у гаспадарцы. Катэгарычна забаранялася хадзіць да калодзежа цяжарнай жанчыне. Гэта магло адбіцца на стане здароўя як яе самой, так і на здароўі будучага дзіцяці. Калі ж гэта забарона парушалася, жанчына кідала ў калодзеж некалькі драбінак солі, каб вада не "пратухла".

Таксама забаранялася браць ваду з калодзежа ў дзень Дабравешчання да ўзыходу сонца і раніцай на Юр'я, калі зямля "адпускае" атруту і робіць юраўскую расу атрутнай.

Лічылася, што калодзеж, які мае сувязь з "тым" светам, здольны пазбаўляць ад хвароб і выконваць жаданні. Асаблівай лекавай сілай валодала калодзежная вада напярэдадні Раства Хрыстовага (6 студзеня), Хрышчэння (18 студзеня), Стрэчання (14 лютага). Вадой, узятай у гэты дзень ранкам, мыліся, паілі хворых, купалі дзяцей і г. д.

На Беларусі існавала правіла: калі нявестка ўпершыню брала ваду ў калодзежы сваёй новай сям'і, то яна павінна была пакласці на зруб невялікі кавалачак вясельнага каравая і кінуць у калодзеж манету. Для таго, каб сямейную пару ніхто не разлучыў, у дзень вяселля таксама закрывалі замок, ключ ад якога кідалі ў калодзеж.

На Каляды калодзеж станавіўся цэнтрам дзявочых варожбаў. Напрыклад, у ноч на Раство Хрыстова дзяўчына закрывала калодзеж на замок, ключ клала пад падушку і загадвала, каб у сне "суджаны прыйшоў вады папіць".

Вада, узятая не з аднаго, а з некалькіх калодзежаў, лічылася асабліва гаючай. Так, знахары, якія выкарыстоўвалі калодзежную ваду, прасілі браць яе з трох, сямі ці дванаццаці калодзежаў.

## Выклікаем дождж

Нашы продкі былі перакананы ў тым, што вада (рака, крыніца, калодзеж) у падземным свеце выходзіць з адной крыніцы. Таму цэнтральнымі аб'ектамі абрадаў, калі неабходна было выклікаць доўгачаканы дождж, станавіліся менавіта яны, і варыянтаў уключэння іх у структуру рытуальна-абрадавага комплексу было даволі шмат.

У шматлікіх мясцінах беларуска-ўкраінскага Палесся практыкавалі выліванне (вычэрпванне ўсёй) калодзежнай вады і абліванне ёю. Гэта магічная акцыя мела наўмысна падкрэслены калектыўны характар. У адзін дзень, калі сонца прыпякала асабліва моцна, усе людзі з усіх крыніц у вёсцы адначасова вылівалі гуртам ваду, тым самым хацелі хутчэй выклікаць "прыцяжэнне" нябеснай вады. Разам з тым існавалі рэгіянальныя адрозненні ў выкананні гэтага абраду. Яго маглі выконваць толькі маленькія дзяўчынкі, тры дзяўчынкі-пагодкі і нават мужчыны-ўдаўцы.

Пра выкананне абраду выклікання дажджу нам расказалі ў 2004 г. у в. Забалоцце Уздзенскага раёна Мінскай вобласці. Раніцай у адным месцы збіраліся тры жанчыны-ўдавы і, ні з кім не размаўляючы, абходзілі дзевяць калодзежаў, сыпалі ў кожны з іх мак-відун, асвечаны ў мінулым годзе на Спаса-Макавея.

Пералік рэчаў, якія ахвяравалі калодзежу, быў даволі значны, сярод іх мак, лушчык (насенне самасейнага льну), асвечанае на Вялікдзень сала, гарох, часнок, асвячонае на Стрэчанне соль. Лічылася, калі ў калодзеж кінуць нож, абавязкова пойдзе дождж. Соль, насенне маку, ільну павінны былі спрыяць такому ж спорнаму дажджу, а памеры гарошын параўноўвалі з кроплямі нябеснай вільгаці.

Узгаданыя рэчы выкарыстоўваліся ў аказіянальных абрадах у архаічныя часы, з прыходам хрысціянства яны павінны былі прайсці дадатковы абрад храмавага асвячэння. Акрамя таго вядомы выпадкі, калі ў калодзеж кідалі крыж або ваду асвячаў святар, тройчы апускаючы ў яе крыж.

Цікавыя варыянты ахвяравання калодзежу або крыніцы запісаны намі ў в. Пералёўка Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці. Для выканання абраду выклікання дажджу адна з жанчын-удоў павінна была ўкрасці ў суседкі гліняны гаршчок і кінуць яго ў калодзеж. А бывалі выпадкі, калі кралі гаршчок з баршчом у суседкі-ўдавы і кідалі ў калодзеж, і тая вымушана была выбіраць з калодзежа ўсю брудную ваду, пасля чаго абавязкова ішоў дождж. Менавіта пра гэта і расказваецца ў дзіцячай песні: "Дощику, дощику, зварю тоби борщику. Мени каша, тоби борщ, щоб ишов густийший дощ".

Не апошнім сродкам выклікання дажджу было галашэнне па тапельцу побач з калодзежам або крыніцай.

**Аксана КАТОВІЧ**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ